Установа адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт
культуры і мастацтваў»

**ЗАЦВЯРДЖАЮ**
Рэктар БДУКМ
____________Ю. П. Бондар
«_____»_____________2015 г.
Рэгістрацыйны № ВД- _____/баз.

# ЧЫТАННЕ І АНАЛІЗ АРКЕСТРАВЫХ ПАРТЫТУР

*Вучэбная праграма ўстановы вышэйшай адукацыі*
*па вучэбнай дысцыпліне для спецыяльнасці*
*1-16 01 06 Духавыя інструменты (па напрамках),*
*напрамку спецыяльнасці 1-16 01 06-11*
*Духавыя інструменты (народныя)*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Мінск
БДУКМ
2015

**СКЛАДАЛЬНІК**

*В. М. Валатковіч,* загадчык кафедры духавой музыкі ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»

**РЭЦЭНЗЕНТЫ:**

*В. В. Кузняцоў,* загадчык кафедры інструментоўкі ўстановы адукацыі «Беларуская дзяржаўная акадэмія музыкі»;
*В. В. Старыкава,* дацэнт кафедры аркестравага дырыжыравання ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»

**РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ:**

*кафедрай* духавой музыкі ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 5 ад 19.12.2013 г.);
*прэзідыумам* навукова-метадычнага савета ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 3 ад 20.02.2014 г.)

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Адказны за рэдакцыю: В. Б. Кудласевіч
Адказны за выпуск: В. М. Валатковіч

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Вучэбная дысцыпліна «Чытанне і аналіз аркестравых партытур» уваходзіць у комплекс музычна-тэарэтычных дысцыплін, агульнай мэтай якіх з’яўляецца глыбокае вывучэнне музычных твораў, а таксама разуменне значных сувязей і заканамернасцей у будаванні партытур для аматарскіх народна-інструментальных ансамбляў ці аркестравых калектываў. Гэтая дысцыпліна дапамагае студэнтам у дарэпетыцыйнай рабоце, у рабоце над творам у час рэпетыцый, а таксама пры канцэртным выкананні твораў.

Вучэбныя заняткі будуюцца з улікам індывідуальных асаблівасцей студэнтаў, узроўнем іх агульнага і музычнага развіцця, асноўваюцца на сумежных дысцыплінах музычна-тэарэтычнага і спецыяльнага цыклаў: «Тэорыя музыкі», «Дырыжыраванне», «Народна-інструментальная музычная культура Беларусі», «Інтэрпрэтацыя народнай музыкі», «Методыка работы з фальклорным калектывам», «Народна-аркестравае выканальніцтва», «Народна-ансамблевае выканальніцтва» і інш.

Засваенне матэрыялу вучэбнай дысцыпліны грунтуецца на лепшых узорах музычнага мастацтва Беларусі, што дазваляе студэнтам, будучым спецыялістам народна-інструментальнага выканальніцтва самастойна чытаць аркестравыя і ансамблевыя партытуры, развіваць асаблівыя навыкі і ўменні па інтэрпрэтацыі (інструментоўцы) у адпаведнасці з канкрэтным саставам аркестра і ансамбля, з якімі яны будуць працаваць.

Асноўная *мэта дысцыпліны* «Чытанне і аналіз аркестравых партытур» – падрыхтоўка спецыялістаў народна-інструментальнага выканальніцтва да самастойнай работы з партытурамі.

Асноўнымі *задачамі дысцыпліны* з’яўляюцца:

– авалоданне асаблівасцямі запісу для традыцыйных тыпавых, а таксама і нетыпавых саставаў ансамбляў і аркестраў народных духавых інструментаў;

– авалоданне навыкамі чытання адпаведных надрукаваных партытур і зноў напісаных інструментовак для ансамбляў ці аркестраў народных духавых інструментаў;

– развіццё навыкаў інструментоўкі і аранжыроўкі для ансамбляў і аркестраў народных духавых інструментаў;

– развіццё навыкаў выканання партытуры на фартэпіяна;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– пашырэнне агульнай музычнай культуры студэнтаў;

– знаёмства з лепшымі творамі беларускіх і замежных кампазітараў.

У выніку засваення дысцыпліны студэнты *павінны ведаць*:

– тэарэтычны матэрыял па сістэмах запісу партытуры для ансамбляў і аркестраў народных духавых інструментаў;

– асноўныя функцыі музычнай фактуры;

– асаблівасці розных стыляў і жанраў;

– спецыфіку сучасных кампазітарскіх тэхналогій;

– прыёмы выканання партытурнага тэксту на фартэпіяна;

*умець*:

– чытаць ансамблевыя і аркестравыя партытуры з улікам разумення сутнасці, асаблівасцей асноўных і варыянтных разнастайнасцей інструментовак на той ці іншы склад ансамбля і аркестра народных беларускіх інструментаў;

– расшыфроўваць спецыяльную тэрміналогію, якая адлюстравана ў ансамблевых і аркестравых партытурах;

– транспанаваць на ўмове адпаведнага транспанавання і неабходнай змены тэсітуры гучання;

– выконваць асобныя фрагменты нотнага тэксту на фартэпіяна;

– сфарміраваць асобныя ўрыўкі нотнага тэксту на фартэпіяна;

*валодаць:*

– спецыфікай аналізу меладычнага голасавядзення, гарманічнага суправаджэння, кантрапункта, фразіроўкі з улікам іх адлюстравання ў партытурах для ансамбляў і аркестраў народных духавых інструментаў;

– спецыфікай музычнай фактуры, навыкамі сальфеджыравання асобных партый;

– навыкамі самастойнай работы з партытурай канцэртных твораў.

Выкарыстанне тлумачальна-ілюстрацыйнага і практычнага метадаў навучання неабходна спалучаць з такімі метадамі і тэхналогіямі, як мастацка-педагагічны, выканальніцкі аналіз твораў, аналіз формы партытуры, а таксама прыёмы пералажэння партытуры для фартэпіяна. Усе гэтыя метады накіраваны на развіццё творчай актыўнасці і самастойнасці мыслення ў студэнтаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Дысцыпліна «Чытанне і аналіз аркестравых партытур» прадугледжвае знаёмства студэнтаў з музычнай класікай, творамі беларускіх кампазітараў, што садзейнічае пашырэнню агульнай музычнай культуры будучых спецыялістаў народна-інструментальнага выканальніцтва.

У адпаведнасці з вучэбным планам на вывучэнне дысцыпліны «Чытанне і аналіз аркестравых партытур» усяго адведзена 214 гадзін, з якіх 122 гадзіны – аўдыторныя заняткі (24 гадзіны – практычныя заняткі, 98 гадзін – індывідуальныя). Рэкамендаваная форма кантролю ведаў студэнтаў – залікі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ПРЫКЛАДНЫ ТЭМАТЫЧНЫ ПЛАН

| Тэмы | Колькасць аўдыторных гадзін | |
|---|---|---|
| | практ. зан. | інд. зан. |
| **Уводзіны** | 2 | |
| *Тэма 1.* Чытанне і аналіз партытур для народна-інструментальных аркестраў і ансамбляў | 4 | 10 |
| *Тэма 2.* Тэрміналогія дысцыпліны «Чытанне і аналіз аркестравых партытур» | 2 | 8 |
| *Тэма 3.* Чытанне і аналіз аркестравых партытур з улікам іх тыпалогіі, афармлення і размеркавання інструментаў | 2 | 8 |
| *Тэма 4.* Сутнасць працэсу транспазіцыі і чытання партыі народных і класічных духавых інструментаў | 2 | 8 |
| *Тэма 5.* Развіццё асноўных уменняў чытання партытур для ансамбляў і аркестраў народных духавых інструментаў | 2 | 10 |
| *Тэма 6.* Фарміраванне практычна-творчых навыкаў у працэсе чытання партытур для ансамбляў і аркестраў народных духавых інструментаў | 2 | 10 |
| *Тэма 7.* Вывучэнне нотнай і спецыяльнай вучэбна-метадычнай літаратуры і іншых інфармацыйных рэсурсаў па чытанні партытур для ансамбляў і аркестраў народных духавых інструментаў (гуказапісаў, відэазапісаў) | 2 | 8 |
| *Тэма 8.* Методыка музычна-тэарэтычнага аналізу партытуры | 2 | 10 |
| *Тэма 9.* Асновы аркестравай драматургіі | 1 | 8 |
| *Тэма 10.* Выканальніцкі аналіз партытуры | 1 | 8 |
| *Тэма 11.* Стварэнне фартэпіяннага клавіра | 2 | 10 |
| **Усяго…** | **24** | **98** |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ

## Уводзіны

Мэта і задачы вучэбнай дысцыпліны. Узаемасувязь з іншымі спецыяльнымі дысцыплінамі.

*Тэма 1. Чытанне і аналіз партытур для народна-інструментальных аркестраў і ансамбляў*

Месца дысцыпліны «Чытанне і аналіз аркестравых партытур» у працэсе падрыхтоўкі спецыялістаў народна-інструментальнага выканальніцтва вышэйшай адукацыі.

Працэс вывучэння партытур для ансамбляў і аркестраў народных духавых інструментаў з улікам асноўных тэндэнцый развіцця нацыянальнай і сусветнай мастацкай культуры.

Асноўныя віды заняткаў, формы бягучага і выніковага кантролю ведаў.

Патрабаванні да выніковай атэстацыі ведаў студэнтаў па дысцыпліне. Месца курса ў падрыхтоўцы спецыялістаў народна-інструментальнага выканальніцтва.

*Тэма 2. Тэрміналогія дысцыпліны «Чытанне і аналіз аркестравых партытур»*

Сутнасць тэрмінаў «партытура», «дырэкцыён», «акалада», «аркестр», «ансамбль», «аркестравая група», «акампанемент», «кантрапункт», «фактура». Аналіз музычных прыкладаў выкарыстання гэтых тэрмінаў у прафесійным і аматарскім выканальніцтве.

Сутнасць тэрміна «музычная фактура»: поліфанічная, падгалосачная, акордава-гарманічная, змешаная.

Спосабы вызначэння фактуры музычнага твора ў працэсе чытання партытур.

*Тэма 3. Чытанне і аналіз аркестравых партытур з улікам іх тыпалогіі, афармлення і размеркавання інструментаў*

Прынцыпы сістэматызацыі і тыпалогіі. Асаблівасці чытання партытур для народна-інструментальных аркестраў і ансамбляў з улікам іх сутнасці, прынцыпаў сістэматызацыі і тыпалогіі. Вызначэнне прынцыпаў афармлення партытур падчас працэсу іх чытання з улікам іх самастойных элементаў для аркестраў і ансамбляў народных духавых інструментаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Функцыі асобных музычных інструментаў у адпаведнасці з выканальніцкімі формамі і музычным матэрыялам партытуры для аркестраў ці ансамбляў, у якіх выкарыстоўваюцца духавыя і ўдарныя інструменты.

Адлюстраванне ў партытурах тыпавога традыцыйнага ці мадыфікаванага народнага духавога, ударнага інструментарыя, адпаведнага сучаснай сусветна вядомай класіфікацыі, яго мастацка-выканальніцкія асаблівасці.

*Тэма 4. Сутнасць працэсу транспазіцыі і чытання партыі народных і класічных духавых інструментаў*

Сутнасць і змест тэрмінаў «транспазіцыя» і «транспанаванне», выкарыстанне іх у працэсе чытання партытур для ансамбляў і аркестраў народных духавых інструментаў.

Прынцыпы класіфікацыі транспануючых інструментаў адпаведна тэсітуры гучання. Адпаведнасці натацыі транспануючых інструментаў у народна-інструментальных ансамблевых, аркестравых партытурах і партыях. Чытанне і транспанаванне партый народных духавых інструментаў у строях: in F, in E, in D, in A, in G.

Прынцыпы класіфікацыі класічных транспануючых інструментаў адпаведна тэсітурнаму гучанню. Чытанне і транспанаванне партый народных духавых інструментаў у строях: in B, in A, in F.

*Тэма 5. Развіццё асноўных уменняў чытання партытур для ансамбляў і аркестраў народных духавых інструментаў*

Афармленне і разуменне сутнасці асноўных і варыянтных разнастайнасцей арыгінальных твораў, інструментовак для розных саставаў ансамбляў і аркестраў народных духавых інструментаў.

Выбар аптымальных варыянтаў для чытання меладычнага голасавядзення, гарманічнага суправаджэння, кантрапункта, фразіроўкі для народных духавых інструментаў.

Вызначэнне аптымальнага дынамічнага балансу гучання ансамблевых галасоў ці аркестравых груп у аркестравых калектывах, народных духавых калектывах.

Вырашэнне пытанняў па вызначэнні метрарытмічных цяжкасцей у аркестравых групах і магчымасці адаптацыі адпаведнага музычнага матэрыялу для будучага выканання інструментальным калектывам.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Тэхналогія чытання незнаёмай партытуры пры выкарыстанні фартэпіяна або свайго духавога інструмента.

Вызначэнне партытур твораў старадаўняй і сучаснай музыкі з абавязковым улікам іх жанрава-стылявых асаблівасцей пры выкарыстанні народных духавых інструментаў.

*Тэма 6. Фарміраванне практычна-творчых навыкаў у працэсе чытання партытур для ансамбляў і аркестраў народных духавых інструментаў*

Тэхналогія выканання на фартэпіяна партытур для розных саставаў ансамбляў і аркестраў, куды ўваходзяць народныя духавыя інструменты.

Сутнасць традыцыйных і спецыфічных прыёмаў гуказдабывання на народных духавых інструментах і графічнага адлюстравання ў партытурах.

Асаблівасці расшыфроўкі спецыяльнай тэрміналогіі. Спецыфіка адпаведных выканальніцкіх штрыхоў.

*Тэма 7. Вывучэнне нотнай і спецыяльнай вучэбна-метадычнай літаратуры і іншых інфармацыйных рэсурсаў па чытанні партытур для ансамбляў і аркестраў народных духавых інструментаў (гуказапісаў, відэазапісаў)*

Асноўныя музычныя прыклады народна-інструментальных ансамбляў і аркестраў, іх музычна-выканальніцкі аналіз: рэпертуарныя зборнікі, партытуры, клавіры і інш.

Вывучэнне спецыяльнай літаратуры па праблемах народна-інструментальнага выканальніцтва, аналіз замежнай і айчыннай літаратуры па пытаннях чытання партытур.

*Тэма 8. Методыка музычна-тэарэтычнага аналізу партытуры*

Методыка аналізу аркестравай фактуры па гарызанталі і вертыкалі. Аналіз формы музычнага твора. Аналіз асобных аркестравых груп і іх узаемасувязі.

Аналіз партытуры па аркестравых функцыях, баланс аркестравага гучання. Гарманічны аналіз партытуры, танальны план. Тэмбрава-дынамічны аналіз партытуры.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Тэма 9. Асновы аркестравай драматургіі*

Роля інструментальных тэмбраў у размежаванні асобных аркестравых функцый, паняцці «чыстыя» і «змешаныя» тэмбры. Паняцці «групавое» і «аркестравае tutti».

Паняцце стылю (гістарычныя эпохі, нацыянальны стыль, індывідуальны стыль кампазітара). Выяўленне стылістычных асаблівасцей музычнага твора. Выяўленне стылістычных асаблівасцей сродкамі аркестравай выразнасці.

*Тэма 10. Выканальніцкі аналіз партытуры*

Асноўныя жанры аркестравай музыкі: сімфонія, уверцюра, сюіта, канцэрт, фантазія, паэма, мініяцюра і інш.

Характарыстыка жанрава-стылявых асаблівасцей аркестравай партытуры.

Методыка жанрава-стылявога і дырыжорска-выканальніцкага аналізу партытуры. Стварэнне выканальніцкай канцэпцыі твора, прадстаўленне рэальнага гучання.

*Тэма 11. Стварэнне фартэпіяннага клавіра*

Спецыфіка фартэпіяннага клавіра. Галоўныя элементы музычнага твора (партытуры) у пералажэнні для фартэпіяна.

Графічнае афармленне клавірнага тэксту. Аналіз фартэпіяннага клавіра з партытурным арыгіналам.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА

## Літаратура

*Асноўная*

1. *Агафонников, Н. Н.* Симфоническая партитура / Н. Н. Агафонников. – 2-е изд. – Л. : Музыка, 1981. – 196 с.

2. *Аносов, Н.* Практическое руководство по чтению симфонических партитур / Н. Аносов. – М. : Музгиз, 1951. – Ч. 1. – 310 с.

3. *Вольф, О. Е.* Хрестоматия по чтению партитур / О. Е. Вольф. – 2-е изд. – Л. : Музыка, 1976. – 264 с.

4. *Гром, У. М.* Дуда ў фальклорна-інструментальнай творчасці беларусаў / У. М. Гром // «Этнашкола» ў сучасным адукацыйным працэсе: вопыт станаўлення і перспектывы развіцця (да 10-годдзя існавання) / уклад. і навук. рэд. праф. І. І. Сучкоў. – Мінск : Бестпрынт, 2004. – С. 81–86.

5. *Гром, У. М.* Школа ігры на беларускіх народных духавых інструментах : вучэб.-метад. дапам. / У. М. Гром, А. Я. Крамко, І. А. Мангушаў. – Мінск : Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў, 2005. – Ч. 2 : Ансамблевае выкананне. – С. 27–66, 73–95, 98–128, 131–139, 145–149, 152–180, 183–212.

6. *Карцев, А. А.* Руководство по графическому оформлению нотного текста / А. Карцев, Ю. Оленев, С. Павчинский. – 3-е изд. – СПб. : Композитор, 2007. – 180 с.

7. *Коротеев, А. Л.* Функциональные и этноорганологические особенности белорусских народных духовых инструментов / А. Л. Коротеев // Міжнародныя Кірыла-Мяфодзіеўскія чытанні, прысвечаныя Дням славянскага пісьменства і культуры, Мінск, 24–26 мая 2004 г. ; рэдкал.: М. А. Бяспалая (адк. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў, 2005. – С. 66–72.

8. *Крамко, А. Я.* Беларускія народныя духавыя інструменты : вучэб. дапам. / А. Я. Крамко. – Мінск : Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў, 2005. – 34 с.

9. *Назіна, І. Д.* Беларускія народныя музычныя інструменты / І. Д. Назіна. – Мінск : Беларусь, 1997. – 239 с.

10. *Фортунатов, Ю. А.* Практическое руководство по чтению симфонических партитур / Ю. А. Фортунатов, И. А. Барсова. – М. : Музыка, 1966. – Вып. 1. – 224 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Дадатковая*

1. *Баренбойм, Л.* Некоторые вопросы воспитания музыканта-исполнителя и система Станиславского / Л. Баренбойм // Музыкальная педагогика и исполнительство. – Л. : Музыка, 1974. – С. 3–61.

2. *Бобровский, В. П.* О переменности функций музыкальной формы / В. П. Бобровский. – М. : Музыка, 1970. – 228 с.

3. *Вахромеев, В. А.* Элементарная теория музыки / В. А. Вахромеев. – М. : Музыка, 2006. – 254 с.

4. *Верхолаз, Р. А.* Вопросы методики чтения нот с листа / Р. А. Верхолаз ; под ред. Т. Л. Беркман. – М. : АПН РСФСР, 1960. – 48 с.

5. *Дмитриев, Г. П.* О драматургической выразительности оркестрового письма / Г. П. Дмитриев ; под общ. ред. Э. Денисова. – М. : Сов. композитор, 1981. – 176 с.

6. *Дмитриев, Г. П.* Ударные инструменты: трактовка и современное состояние / Г. П. Дмитриев. – М. : Сов. композитор, 1973. – 136 с.

7. *Зряковский, Н. Н.* Общий курс инструментоведения / Н. Н. Зряковский. – 2-е изд. – М. : Музыка, 1976. – 479 с.

8. *Карс, А.* История оркестровки / А. Карс ; под ред. М. Иванова-Брецкого, Н. Корндорфа. – М. : Музыка, 1990. – 304 с.

9. *Крунтяева, Т.* Словарь иностранных музыкальных терминов / Т. Крунтяева, Н. Молокова. – М. : Музыка, 2007. – 184 с.

10. *Мазель, Л. А.* Вопросы анализа музыки / Л. А. Мазель. – М. : Сов. композитор, 1991. – 376 с.

11. *Медушевский, В. В.* О закономерностях и средствах художественного воздействия музыки / В. В. Медушевский. – М. : Музыка, 1976. – 254 с.

12. *Назайкинский, Е. В.* О музыкальном темпе / Е. В. Назайкинский. – М. : Музыка, 1965. – 96 с.

13. *Назайкинский, Е. В.* Стиль и жанр в музыке / Е. В. Назайкинский. – М. : ВЛАДОС, 2003. – 248 с.

14. *Пазовский, А. М.* Записки дирижера / А. М. Пазовский ; общ. ред. В. Кухарского. – 2-е изд. – М. : Сов. композитор, 1968. – 558 с.

15. *Раабен, Л. Н.* Об объективном и субъективном в исполнительском искусстве / Л. Н. Раабен // Вопросы теории и эстетики музыки. – М. : Музгиз, 1962. – Вып. 1. – С. 20–51.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*16. Скребков, С. С.* Художественные принципы музыкальных стилей / С. С. Скребков. – М. : Музыка, 1973. – 448 с. : с нот. ил.

*17. Способин, И. В.* Музыкальная форма: учебник общего курса анализа / И. В. Способин. – М. : Музыка, 2002. – 400 с.

*18. Финкельштейн, И. Б.* Некоторые проблемы оркестровки. Напряженность оркестрового тембра и оркестровая динамика / И. Б. Финкельштейн. – М. ; Л. : Музыка, 1964. – 39 с.

*19. Цуккерман, В.* О музыкальной речи Н. А. Римского-Корсакова, тембр и фактура в оркестровке Римского-Корсакова / В. Цуккерман // Музыкально-теоретические очерки и этюды. – М. : Сов. композитор, 1975. – Вып. 2. – С. 341–464.

*20. Чулаки, М. И.* Инструменты симфонического оркестра / М. И. Чулаки. – 4-е изд. – СПб. : Композитор, 2004. – 224 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Пералік сродкаў дыягностыкі вынікаў вучэбнай дзейнасці студэнтаў

Кантроль вучэбнай дзейнасці студэнтаў па дысцыпліне «Чытанне і аналіз аркестравых партытур» ажыццяўляецца з дапамогай наступных форм дыягностыкі:

– вуснае апытанне;
– кантрольнае тэсціраванне;
– стварэнне электроннай партытуры твора;
– аўдыязапіс;
– напісанне анатацыі да выконваемых твораў;
– залік.

## Метадычныя рэкамендацыі па арганізацыі і выкананні самастойнай работы студэнтаў

Самастойная работа студэнтаў па дысцыпліне «Чытанне і аналіз аркестравых партытур» ажыццяўляецца падчас пазааўдыторных заняткаў у бібліятэках, вучэбных аўдыторыях універсітэта, установах культуры, інтэрнаце. З мэтай яе эфектыўнай арганізацыі студэнтам мэтазгодна выконваць адпаведны аб'ём работы пасля знаёмства з матэрыяламі індывідуальных заняткаў.

Дзеля ажыццяўлення самастойнай падрыхтоўкі студэнтаў, з мэтай засваення неабходных матэрыялаў дысцыпліны «Чытанне і аналіз аркестравых партытур», ім неабходна вызначыць сутнасць і змест тэрмінаў «транспазіцыя», «інтэрвал транспазіцыі» і адзначыць іх у пісьмовай форме ў асабістых канспектах.

З мэтай актывізацыі вучэбна-пазнавальнай дзейнасці студэнтаў прапануецца работа са спецыяльнай літаратурай бібліятэчных фондаў па засваенні асаблівасцей гісторыка-факталагічных аспектаў працэсу эвалюцыі народнага духавога і ўдарнага музычнага інструментарыя Беларусі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Вучэбнае выданне*

**ЧЫТАННЕ І АНАЛІЗ АРКЕСТРАВЫХ ПАРТЫТУР**

*Вучэбная праграма ўстановы вышэйшай адукацыі*
*па вучэбнай дысцыпліне для спецыяльнасці*
*1-16 01 06 Духавыя інструменты (па напрамках),*
*напрамку спецыяльнасці 1-16 01 06-11*
*Духавыя інструменты (народныя)*

Карэктар В. Б. Кудласевіч
Тэхнічны рэдактар Л. М. Мельнік

Падпісана ў друк 2015. Фармат 60x84 $^1/_{16}$.
Папера пісчая № 2. Рызаграфія.
Ум. друк. арк. 0,87. Ул.-выд. арк. 0,49. Тыраж экз. Заказ .

Выдавец і паліграфічнае выкананне:
УА «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы,
распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 1/177 ад 12.02.2014.
ЛП № 02330/456 ад 23.01.2014.
Вул. Рабкораўская, 17, 220007, г. Мінск.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ